Установа «Дзяржаўны архіў Магілёўскай вобласці»

Віртуальны праэкт «Выдатныя людзі Беларусі»

# Аляксей Пысін – паэт-воін

Гэта прэзентацыя прысвечана жыццю і творчасці Аляксея Васільевіча Пысіна (1920–1981) — выдатнага беларускага савецкага паэта і журналіста, лёс якога быў неразрыўна звязаны з трагічнымі падзеямі Другой сусветнай вайны. Яго творы сталі голасам пакалення, перажыўшага франтавыя гады, і працягваюць натхняць чытачоў глыбокім рэалізмам і чалавечнасцю.



# Раннія гады і пачатак творчага шляху

Аляксей Васільевіч Пысін нарадзіўся 22 сакавіка 1920 года ў вёсцы Высокі Борак Краснапольскага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і: маці Хрысціна Рыгораўна, бацька Васіль Пятровіч. Дзяцінства будучага паэта праходзіла ў роднай вёсцы, і спазнала тое, што ад веку выпадала спазнаць сялянскаму хлапчуку: радасці, уцехі і, адначасова, нялёгкую працу, а праз працу – рана спасцігнуты сэнс жыцця.
У 1928 годзе Аляксей пачаў вучыцца ў першым класе Высокаборскай пачатковай школы.

Яго настаўніца Ефрасіння Самсонаўна Анішчанка заклала падмурак каліграфічнага почырку будучага журналіста і паэта. З вучнямі пачатковай школы яна ставіла спектаклі, стварыла дзіцячы хор, дзе Аляксей быў адным з першых сярод выканаўцаў мастацкіх задумак настаўніцы. Першыя спробы пяра Аляксей Пысін зрабіў яшчэ будучы вучнем Высокаборскай сямігодкі. Сярэднюю адукацыю атрымаў у вёсцы Палуж, да якой было дзесяць кіламетраў.



Алёша Пысін і яго брат Лёнька у дзіцячыя гады

(Фота з альбома «Пра ўсё, чым жыць павінны…», падрыхтаванага УК «Цэнтралізаваная сістэма дзяржаўных публічных бібліятэк г. Магілёва»)



З маці Хрысцінай Рыгораўнай каля роднага дома

Фота з альбома «Пра ўсё, чым жыць павінны…», падрыхтаванага УК "Цэнтралізаванаая сістэма дзяржаўных публічных бібліятэк г. Магілёва".



Бацька Аляксея Пысіна – Васіль Пятровіч (другі злева)

(Фота з альбома «Пра ўсё, чым жыць павінны…», падрыхтаванага УК «Цэнтралізаванаая сістэма дзяржаўных публічных бібліятэк г. Магілёва»)

Першыя вершы ён, выпускнік сярэдняй школы, прынёс на суд земляку-паэту Петрусю Бядуліну, які працаваў тады ў рэдакцыі Краснапольскай раённай газеты «Чырвоны сцяг». Адзін з іх, «Ураджай», быў надрукаваны ў ёй у 1938 годзе. Пятрусь Бядулін з'явіўся першым настаўнікам і крытыкам мастацкага слова будучага паэта Пысіна.



УРАДЖАЙ

Прысады ўсталі з двух бакоў
Бярозай, клёнам і вярбою—
Не вышла-б жыта з берагоў,
Не заліло-б бальшак прыбоем.
А хвалі жытнія шумяць,
Вось-вось не вытрымаць плаціне,
І мора вырвецца гуляць,
І на дарогу раптам хлыне.
На месцы дрэвы: хоць-бы што!
Да ўсіх нягод яны прывыклі,
І нават буслава гняздо
На дол не ўроніць ні былінкі.
І шэпчуць, шэпчуць каласы,
Блішчаць расінкі, нібы слёзы,
К жніву ім хоць-бы дарасці
Да ўзроўню маладой бярозы.
І нібы вадаспад, затым
Скаціцца хвалямі ўраджаю.
Дарэмна! Зернем залатым
Калоссі сонца налівае.
Больш не падняцца ім уверх,
Бо важка золата празмерна,
Пакуль камбайн не заплыве,
Каб вычарпаць да каплі зерне.

А. ПЫСІН.

Чырвонаполле.

«Фота з Магілёўскай абласной газеты
«За Радзіму» за 1946 год
(«З фондаў установы «Дзяржаўны архіў Магілёўскай вобласці»)



У 1937 годзе, пасля заканчэння Палужскай сярэдняй школы райком камсамола накіраваў яго, як актыўнага селькора на вучобу ў Мінскі Камуністычны інстытут журналістыкі імя С. М. Кірава. У верасні 1939 года, пасля ўз’яднання Усходняй і Заходняй Беларусі, яго, тады студэнта другога курса, накіравалі на працу ў горад Бельск на Беласточчыне. Там, спачатку ў Бельскай павятовай, а затым у раённай газеце «Чырвоная звязда», ён працаваў да 22 чэрвеня 1941 года.



Камуністычны інстытут журналістыкі імя С.М. Кірава

(Фота з кнігі: Куркоў І. Мінск незнаёмы. 1920-1940. – Мінск: Ураджай, 2002)



# Ваенны шлях: удзельнік Другой сусветнай вайны

1

## На пяці франтах

Аляксей Пысін удзельнічаў у баях на пяці франтах: Заходнім, Калінінскім, Ленінградскім, 1-м і 2-м Прыбалтыйскіх франтах. Двойчы быў цяжка паранены.

2

## Сувязіст радавы

Гвардыі радавы Пысін прайшоў усю вайну сувязістам - забяспечваў бесперабойную кабельную сувязь пярэдняга краю з камандаваннем. Яго зброяй была вінтоўка, катушка з провадам-кабелем і палявы тэлефонны апарат..

3

## След у памяці паэта

Вайна пакінула незабыўны след у памяці паэта. Нягледзячы на тое, што, будучы салдатам, ён ніколі не браў у рукі пяро і воляю лёсу ў гады вайны апынуўся па-за літаратурнай атмасферай, адным з цэнтраў творчасці А. Пысіна з'яўляецца вайна.

Made with GAMMA

# Аляксей Пысін — франтавік

Узнагароджаны медалямі, у тым ліку медалём «За адвагу», салдат Пысін сустрэў Дзень Перамогі ў Латвіі, на беразе Балтыйскага мора.



Аляксей Пысін

(Фота з інтэрнэт-сайта інфармацыйнай сістэмы «Памяць народа»)






Все графы заполнять полностью

Наградной лист

1. Фамилия, имя и отчество Пысин Алексей Васильевич
2. Звание Кр-ец 3. Должность, часть Линейный надсмотрщик 1060 отд. кав. шест. роты

Представляется к правительств. награде медалью за отвагу

4. Год рождения 1920 5. Национальность белорус 6. Партийность чл. ВКП(б)
7. Участие в гражданской войне, последующих боевых действиях по защите СССР и отечественной войне (где, когда) 1 Прибалт. фронт с марта м-ца 1942 г.
8. Имеет ли ранения и контузии в отечественной войне Имеет
9. С какого времени в Красной Армии с февраля 1942 г 10. Каким РВК призван Краснопольским РВК Могилевской обл.
11. Чем ранее награжден (за какие отличия) Не награждался
12. Постоянный домашний адрес представляемого к награждению и адрес его семьи

I. Краткое, конкретное изложение личного боевого подвига или заслуг

т. Пысин на фронте отечеств. войны находится с марта м-ца 1942 г. Работая линейным надсмотрщиком показал себя смелым инициативным решительным связистом. 30 июня 1944 г. при обслуживании связи КП 100 ск с ВПУ 4-й уд. армии в р-не Залужи при наводке линии по сильно болотистой пересеченной местности на участке где работал т. Пысин от сильного арт мин огня противника линия несколько раз подвергалась порыву но он не взирая ни на какую опасность увлекая за собой товарищей быстро устранял повреждения и тем самым в нужную минуту боя обеспечил без перебойной связью командование ВПУ 4-й уд. армии с КП 100 ск. 1-го июля 1944 г. при форсировании реки Полота под сильным арт мин огнем противника устранял повреждения линии и тем самым поддерживал безперебойную связь КП 100 ск с ВПУ 4-й уд. армии.

т. Пысин предан делу партии Ленина Сталина и социалистической родине. Достоин правительственной награды

«8» июня 1944 г. Командир

«Узнагародны ліст А.В. Пысіна да медаля «За адвагу

(«З інтэрнэт-сайта інфармацыйнай сістэмы «Памяць народа»)




# Літаратурная спадчына

> «Вайна не заканчваецца, пакуль не закрыта апошняя старонка. Пакуль не расказана ўся праўда».

### Паэтычныя зборнікі

Яго паэтычныя зборнікі глыбока раскрываюць тэмы вайны, чалавечага лёсу, страт і нязломнага духа.

### Рэалізм і перажыванні

Творчасць А.В. Пысіна напоўнена пранізлівым рэалізмам і глыбокімі асабістымі перажываннямі, якія адлюстроўваюць боль і надзею.

### Уклад у літаратуру

Ён унёс значны ўклад у развіццё ваеннай і партыятычнай беларускай літаратуры пасляваеннага перыяду, стаўшы адным з яе ключавых прадстаўнікоў.

Made with GAMMA

Дэмабілізаваўшыся з арміі, да 1948 года Аляксей Пысін працаваў адказным сакратаром Краснапольскай раённай газеты «Чырвоны сцяг». З 1949 па 1950 гады быў уласным карэспандэнтам Магілёўскай абласной газеты «За Радзіму», а з мая 1950 года працаваў рэдактарам у палітаддзеле Свержанскай МТС Стаўбцоўскага раёна Баранавіцкай вобласці.



Алесь Пысін

РАКА

Па праўдзе оказаўшы, фізічная карта
Не лічыцца з рэкамі гэткімі.
Плывуць яе хвалі ні ціха, ні шпарка;
Не к спеху ім з смеццем ды трэскамі.

А трэскі на хвалях з стагодняга дубу,
Збірае з іх рэчка флатылію
І мусіць няўцям ёй, што людзі на службу
Бяруць яе розумам—сілаю.

Спрадвечную плесню, зацішша і ціну
Дубовыя сваі распырскалі.
І хутка ўжо мёртвай пятлёю плаціна
Ўзніме ўверх воды празрыстыя.

І кола турбіны струмень вадаспада
Праверыць сваімі ладонямі.
Імклівыя хвалі ў калгасныя хаты
Памчацца агнямі цудоўнымі.

Верш А. Пысіна з літаратурнай старонкі ў магілёўскай абласной газеце «За Радзіму», 1946 год

(З фондаў установы «Дзяржаўны архіў Магілёўскай вобласці»)



ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

ЗА РАДЗІМУ

ОРГАН МАГІЛЕЎСКАГА АБКОМА І ГАРКОМА КП(б)Б, АБЛАСНОГА І ГАРАДСКОГА СОВЕТАЎ ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ



Вячэрняя школа не мае патрэбных умоў

8 гадзін вечара. Па раскладу ў Чырвонапольскай вячэрняй школе рабочай моладзі павінен закончыцца першы ўрок, але заняткі яшчэ не пачыналіся.

У настаўніцкай невядома каго чакаюць: ці настаўнікаў, якія пайшлі на метадычныя заняткі, ці вучняў.

—Пачакаем яшчэ крыху,—гаворыць дырэктар школы тав. Пузянкоў.

Чакаюць і вучні. У памяшканні восьмага класа цьмяна мігае лампа без шкла. Пры святле гэтай лампы, якая больш чадзіць, чым свеціць, нельга ні чытаць, ні пісаць.

Цяжка вучыцца ў такіх умовах. Урокі ўвесь час зрываюцца: то газы няма, то настаўнікі перагружаны. Няма падручнікаў, паперы, алоўкаў...

З кожным днём расце адсеў. У першыя дні школу наведвала 112 чалавек, а зараз менш паловы —45—50. Тры класы—VI, VII і X—ужо закрыты.

Дырэктар школы тав. Пузянкоў паадбіваў парогі ў райвна, каб дапамаглі набыць хоць добрыя лампы. Але апрача аднаго адказу загадчыка аддзела тав. Шалухіна — „трымайце вучняў, каб не разбегліся“—нічога не здолеў дабіцца.

Работнікі райвна толькі два разы заглянулі ў школу, паабяцалі многа чаго, але канкрэтнай дапамогі не ідаць.

Пазіцыю пабочнага назіральніка займае і райком комсамола. Яго прадстаўнікоў з пачатку навучальнага года не бачылі ў вячэрняй школе.

А. Пысін.

Чырвонапольскі раён.

Першы пасляваенны артыкул А. Пысіна ў Магілёўскай абласной газеце «За Радзіму» ад 24 лістапада 1946 года

(З фондаў установы «Дзяржаўны архіў Магілёўскай вобласці»)

У 1950 годзе Аляксея Васільевіча Пысіна прынялі ў члены Саюза пісьменнікаў СССР. Першая кніга Аляксея Пысіна «Наш дзень» выйшла ў свет у 1951 годзе, праз 13 гадоў пасля з’яўлення ў друку яго першых вершаў. За гэты час паэт прайшоў вялікую і суровую школу жыцця. У кнізе шырока выявіліся ненатоленая прага жыцця, імкненне заглянуць у кожны яго куточак, прывітаць дзень аднаўлення разбуранай вайной краіны. Гэта звязана з біяграфіяй паэта, з самаадчуваннем былога франтавіка, які блізка глядзеў у вочы смерці.



Аляксей Пысін у 1950 годзе

(Фота з альбома «Пра ўсё, чым жыць павінны…», падрыхтаванага УК «Цэнтралізаванаая сістэма дзяржаўных публічных бібліятэк г. Магілёва»)

Вокладка першага зборніка вершаў Аляксея Пысіна

«Наш дзень»

(Фота з віртуальнай выставы УК «Магілёўская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна» «Паэт слова»)



Аляксей Пысін і Віктар Арцем’еў, 1958 год

(Фота з інтэрнэт-сайта Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі)





АДДЗЕЛ РАДЫЁІНФАРМАЦЫІ
...ЕННЯ КУЛЬТУРЫ МАГІЛЁЎСКАГА АБЛАСНОГА СОВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

24. лістапада 1955 г.

Рэдакцыя Грам.паліт.вяшч.

УВАГА!

ГАВОРЫЦЬ МАГІЛЁЎ

7 ГАДЗІН 37 МІНУТ

Пачынаем літаратурную перадачу.

(назва радыёперадачы)

У перадачы 15 старонак

Рэдактар

Упаўнаважаны абліта

Перадача адбылася 7 г. 37 м. 7 52 с.

Дыктар



...тар: Слухайце другі выпуск нашага літаратурнага радыё-альманаха.

Сягоння мы перадаем вершы ўдзельнікаў абласнога літаратурнага аб"еднання, членаў саюза совецкіх пісьменнікаў Беларусі, паэтаў Васілія Матэвушава і Аляксея Пысі... ...маладых паэтаў Александра Сіманава і Сяргея Храмя... ...апавяданне Уладзіміра Мазіліна.

Праслухайце вершы Аляксея Пысіна.

x x
x

Перад мікрафонам паэт Васіль Матэвушаў.

x x x

Перадаем вершы Сяргея Храмянкова.

x x
x

Свой верш "На Дняпроўскай кручы" прачытае ... Сіманаў.

x x
x

Слухайце новае апавяданне Уладзіміра Мазі... "Сустрэча". Перад мікрафонам аўтар.

x x
x

Вы слухалі другі выпуск нашага літарату... радыёальманаха.

Таварышы радыёслухачы! Вашы водгукі аб пра... перадачы і пажаданні шліце нам па адрасу: Магіл... ...ом Советаў, аддзел радыёінфармацыі.

x x
x



РОЗДУМ

Патронаў цесныя абоймы.
Вінтоўка. Некалькі гранат.
Іголку лішнюю з сабою
І то ў паход не браў салдат.
Шлях -ад прывала да прывала,
І з ходу ў бой,
І з бою ў бой...
І, хоць мінула год нямнога,
Я верны звычцы франтавой.
У чамадане - дзве -тры свежых
Кашулі, фота тых гадоў.
І нават з кніжкі сваіх вершаў
Я частку выкінуць гатоў.
Кватэра - домік комунгаса,
Ані канап, ні дыванoў.
Тут Сож, а можа ў хуткім часе
Мне быць над Волгай ці Дзвіной.
Каб не адстаць, не прамарудзіць,
І там, дзе трэба, стаць у строй,
Заўжды маім дэвізам будзе:
--Нічога лішняга з сабой.
Калісь вытрэсваў на паветры
Паходны рэчавы мяшок.
Вось так часамі ў свае сэрца
Заглядваю з кутка ў куток:
Мо завялася пацяруха
І плесня - лішні супакой ?
Ці ўсе раблю, што могуць рукі,
Што можа розум мой ?

Аляксей Пысі...
рэдакцыя райга...



АСЕННІ КЛЕН.

Праз лісце яго, як праз пальцы,
Нямала прапушчана дзіў.
Кінжалы маланак ён мацаў
І светлыя ліўні цадзіў.

Узносіў ён дугі радуг
Над возам садоў і траў,
З магутных сукоў - рагатак
За выраем вырай пускаў.

І можа не жоўтае лісце
Мы топчам на сцежках сырых,
А радугі і бліскавіцы,
Што ў злітках ляглі залатых.

А.В.Пысін,Чэрыкаў,райгазета.

Стэнаграма літаратурнай перадачы з удзелам А. Пысіна на Магілёўскім радыё, 1955 год

(Установа «Дзяржаўны архіў Магілёўскай вобласці» (ДАМаг). Фонд. 809, Воп. 5, Спр. 153, Ар. 30-33)

Добрай школай паэтычнага выхавання сталі для А.В. Пысіна Вышэйшыя літаратурныя курсы щў Маскве, на якія ён паступіў у 1956 годзе. Вучоба ў Маскве засталася ў памяці паэта на ўсё жыццё



Будынак Літаратурнага інстытута імя А.М. Горкага у Маскве ў 1950-1960-я гады

(Фота з інтэрнэт-сайта ФДБАУ ВА «Літатратурны інстытут імя А.М. Горкага»)




А.А. Савіцкі, У. Ярмак, А. Пысін у Маскве, 1958 год

(Фота з віртуальнай выставы Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастцтва «Вечна жывы агонь» (да 100-годдзя А.А. Савіцкага))










Паэтычныя зборнікі Аляксея Пысіна: «Сіні ранак» (1959), «Сонечная паводка» (1962), «Мае мерыдыяны» (1962), «Твае далоні» (1967)

(Ілюстрацыі з віртуальнай выставы УК «Магілёўская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна» «Паэт слова»)

Made with GAMMA

# «Магілёўская праўда»

Пасля заканчэння ў 1958 годзе літаратурных курсаў Аляксей Пысін, да выхаду на пенсію, жыў у Магілёве і працаваў у рэдакцыі газеты «Магілёўская праўда». Падчас журналісцкай працы Пысін неаднаразова пісаў пра людзей вёскі, пра іх працу, беражлівыя адносіны да народнай культуры, у прыватнасці да народнай песні. Ён не проста захапляўся працай даяркі, свінаркі, цялятніцы, паэтызуючы працоўнага чалавека, але і імкнуўся разабрацца глыбей, знайсці карані працоўнага гераізму ў самой аснове псіхалогіі савецкага чалавека.



Аляксей Пысін, Генадзь Суднік, Іван Аношкін, Анатоль Борчык у кабінеце аддзела навін газеты «Магілёўская праўда», 1970-я гады

(Фота з сайта Magilev.by)



Члены літаратурнага аб’яднання пры газеце «Магілёўская праўда», у якое ўваходзіў і А.Пысін, 1962 год

(Фота з інтэрнэт-сайта інфармацыйнага агенцтва «Мінская праўда»)

У рэдакцыі газеты «Магілёўская праўда», 1960-я гады

(Фота з персанальнага бібліяграфічнага паказальніка «Аляксей Пысін – журналіст»)





З супрацоўнікамі газеты «Магілёўская праўда», 1960-я гады

(Фота з персанальнага бібліяграфічнага паказальніка «Аляксей Пысін – журналіст»)



ПРАТАКОЛ № 22 28

пасяджэння рэдкалегіі ад 31 кастрычніка 1966 года.

ПРЫСУТНІЧАЛІ: тт..Цітавец,Карпенка,Крыскавец,Дужын, Гарадзецкі

СЛУХАЛІ: Аб лепшых матэрыялах за другую палавіну кастрычніка.

ПАСТАНАВІЛІ: Прызнаць лепшымі матэрыяламі і аплаціць іх авышаным ганарарам :

1.А.Пысіна."Вечар у Белай Дуброве".(№ 211)

2.Карэспандэнцыі І.Ісачанкі" У новым раёне"(№ 209 ,211)_

3.Рэйд "І з абмерам, і з абвесам" , арганізаваны В.Анцыферавым (№ 212).

4.Фельетон В.Гільбурда " Да нас едзе рэвізор" (№ 215).

АДКАЗНЫ САКРАТАР (Я.КРЫСКАВЕЦ)

Пратакол рэдкалегіі газеты «Магілёўская праўда», аб прызнанні адным з лепшых матэрыяла А. Пысіна, 1966 год

(ДАМаг. Ф. 2403, Воп. 1, Спр. 72, Ар. 28)

# Узнагароды і прызнанне

### Узнагароды

За свае баявыя заслугі і значны літаратурны ўклад Аляксей Пысін быў адзначаны ўзнагародамі.

### Павага

Ён карыстаўся глыбокай павагай як сярод франтавікоў, так і ў літаратурнай супольнасці, быў прызнаным майстрам слова.

### Уклад

Яго творчасць і асабісты прыклад сыгралі бясцэнную ролю ў патрыятычным выхаванні моладзі, перадаючы каштоўнасці мужнасці і доўга.



(Фота з інтэрнэт-сайта інфармацыйнага агенцтва «Мінская праўда»)

У 1968 годзе Аляксею Васільевічу Пысіну была прысуджана Дзяржаўная прэмія БССР імя Янкі Купалы. У 1980-м годзе Аляксей Васільевіч Пысін атрымаў званне заслужанага работніка культуры БССР, а ў 1981 быў узнагароджаны ордэнам Дружбы народаў



З ПАЭТЫЧНАГА СШЫТКА

Аляксей ПЫСІН

Балада пра Фёдара Ракушава, запісаная ў вёсцы Ракушава Круглянскага раёна

Чарнігаўцы

Сон пад гадзіннікам

Павел Кабзарэўскі

Грыбная пара.

Фота А. ГЛІНСКАГА.

6



Аляксей ПЫСІН. Май 1981 г.

Фота Ул. СІЗА

Вершы А. Пысіна на старонках газет,

1980-я гады

(ДАМаг. Ф. 1244, Воп. 32, Спр. 21, Ар. 3,6,36)



ПАЭЗІЯ

Аляксей ПЫСІН

НЕДАСПЕЛЫ БУРШТЫН НЕ ШУКАЮ

Балада пра сувязіста

Дубовыя вянкі

У вагоне

Летняя ноч

Рабая

Шчылінка на куфры

Дняпро-працаўнік.

Фота З. ШАГЕЛЬМАНА

# Уплыў на сучасную культуру і літаратуру

### Вывучэнне

Творы Аляксея Пысіна актыўна вывучаюцца ў вышэйшых навучальных установах і з’яўляюцца прадметам навуковых даследванняў у літаратурных колах.

### Натхненне

Яго вершы і расказы працягваюць натхняць новае пакаленне паэтаў і даследчыкаў на асэнсаванне гісторыі і чалавечай прыроды.

### Грамадскія мерапрыемствы

Аляксей Пысін быў частым госцем на грамадскіх мерапрыетымствах, прысвечаных памяці Вялікай Айчыннай вайны, дзе дзяліўся сваім вопытам і мудрасцю.



Выступленне А. Пысіна на творчым вечары ў Мінску, 1980 год

(Фота з інтэрнэт-сайта інфармацыйнага агенцтва «Мінская праўда»)

Творы Аляксея Васільевіча Пысіна перакладзены на рускую, украінскую і іншыя мовы. На яго вершы кампазітарамі Л.  Курачком, І. Пятровым-Кумінскім і .Ю. Федуненкам напісаны песні






3

Чайкі        А. Пысін

Калышыся, мора, калышыся,
Налівайся сонцам і вятрамі,
У тваім высокім сінім жыце
Ходзяць жнеі з белымі сярпамі.

І не плачуць жнеі, не галосяць,
Не заходзяцца душою ў спеве.
У людзей маўкліва хлеба просяць,
Бо чамусьці жыта позна спее.

Крошкі, што прынесены на бераг,
Пазнікалі голасна і ціха.
Нада мною столькі хустак белых,
Можа, тут і матчына хусцінка.



2

Алексей Пысин

Чайки

Ты волнуйся, море, ты волнуйся,
Наливайся солнцем и ветрами;
В синем жите, как на Беларуси,
Ходят жнеи с белыми серпами.

И все плачут жнеи, не рыдают,
И поют легко и деловито.
Молчаливо хлеба ожидают
От людей. У них дозрело жито.

Крошки, принесенные на берег,
Исчезают с криками и молча.
Надо мною свет платочков белых...
Может, здесь и матери платочек.

Перевел А. Мельников

Пераклад верша «Чайка» на рускую мову, выкананы А. Мельнікавым

(ДАМаг. Ф. 1244, Воп. 41, Спр. 3, Ар. 2,3)



# Аляксей Пысін сёння: памяць і спадчына

### Архівы і публікацыі

Сёння вялікія архівы і шматлікія публікацыі захоўваюць багатую творчую спадчыну Аляксея Пысіна для будучых пакаленняў.

### Мемарыяльныя праэкты

У яго гонар праводзяцца мемарыяльныя праекты, літаратурныя вечары і каферэнцыі, якія увекавечваюць памяць пра яго.

### Значэнне для гісторыі

Жыццё і творчасць Аляксея Пысіна маюць вялікае значэнне для разумення гісторыі Беларусі і ўплыву вайны на лёсы людзей.

(Фота з інтэрнэт-сайта Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі)

Made with GAMMA

27 жніўня 1981 года Аляксея Васільевіча Пысіна не стала. Ён пахаваны ў Магілёве на Польскіх могілках па вуліцы Лазарэнкі. На магіле паэта ўстаноўлены гранітны помнік з яго барэльефам. Надмагільная пліта мае вершаваныя радкі, якія напісаў паэт за 15 год да сваёй смерці:

...Я гляджу на даўняе курганне,
На траву, на рыжых мурашоў.
Ведайце: калі мяне не стане,
Я ў сваю дывізію пайшоў.



Помнік Аляксею Пысіну на могілках

(Фота з адкрытых крыніц сеткі Інтэрнэт)



Музей А. Пысіна ў Палужскай сярэдняй школе Краснапольскага раёна

(Фота з віртуальнай выставы УК «Магілёўская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна» «Паэт слова»)

Мемарыяльная дошка на доме, дзе жыў паэт

(Фота з віртуальнай выставы УК «Магілёўская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна» «Паэт слова»)



У Магілёве імём Аляксея Пысіна названа вуліца.




Рашэнне Магілёўскага гарвыканкама ад 6 сакавіка 2008 года №10-15 аб прысваенні імя Аляксея Пысіна новай вуліцы

(ДАМаг. Ф. 11, Воп. 10, Спр. 124, Ар. 82-83)

82

**Магілёўскі гарадскі Савет дэпутатаў 25 склікання Рэспубліка Беларусь**

**Могилевский городской Совет депутатов 25 созыва Республика Беларусь**

**РАШЭННЕ**
**РЕШЕНИЕ**

«6» марта 2008г. № 10-15
г. Могилев

О наименовании, переименовании улиц, переулков и сквера в городе Могилеве

В соответствии с пунктом 14 статьи 16 Закона Республики Беларусь «О местном управлении и самоуправлении в Республике Беларусь» от 20 февраля 1991 года в редакции Закона Республики Беларусь от 10 января 2000 года, статьи 15 Закона Республики Беларусь от 5 мая 1998 года «Об административно-территориальном делении и порядке решения вопросов административно-территориального устройства Республики Беларусь», на основании заключений городской комиссии по топонимике и увековечиванию исторического и культурного наследия города Могилева (протоколы от 29 декабря 2007г. и от 28 февраля 2008г.) и решений Могилевского городского исполнительного комитета от 14 января 2008г. №1-14 «О предложениях о наименовании, переименовании улиц, переулков и сквера в города Могилеве», от 3 марта 2008г. №5-34 «О наименовании переулков в городе Могилеве», Могилевский городской Совет депутатов РЕШИЛ:

1.Принять предложения о наименовании вновь образованных улиц, переулков и сквера в городе Могилеве

1.1.улица имени Терехина – вуліца імя Цярохіна;
1.2.улица имени Златоустовского – вуліца імя Златаўстаўскага;
1.3.улица имени Алексея Пысина – вуліца імя Аляксея Пысіна;
1.4.улица имени Аркадия Кулешова – вуліца імя Аркадзя Куляшова;
1.5.переулок Малиновый – завулак Малінавы;
1.6.переулок Ягодный – завулак Ягадны;
1.7.сквер на пересечении улиц Якубовского и Сурганова – сквер Героев танкистов – Герояў танкістаў;
1.8.переулок 1-ый Павлова - завулак 1-шы Паўлава;
1.9.переулок 2-ой Павлова - завулак 2-гі Паўлава;
1.10.переулок 3-ий Павлова - завулак 3-і Паўлава;
1.11.переулок 4-ый Павлова - завулак 4-ты Паўлава;
1.12.переулок 5-ый Павлова - завулак 5-ты Паўлава.

83

2.Переименовать улицу Центральную, в бывшей деревне Казимировка, включенной в городскую черту, в улицу Ручейную - вуліцу Ручэйную.

3.Контроль за выполнением настоящего решения возложить на постоянную комиссию Могилевского городского Совета депутатов по мандатам, депутатской этике, местному управлению и самоуправлению.

Председатель Могилевского городского Совета депутатов В.Т.Свистунов



С. ГАЎРУСЕЎ.

# ПАМЯЦІ АЛЯКСЕЯ ПЫСІНА

На небасхіле —
профіль Магілёва:
Асэнсаванай доблесці граніт.
Аранжава,
пурпурна
і лілова
Адсвечвае абветраны зеніт,
І, выступаючы з плячыстай далі,
Лясною шчабятлівасцю гадоў
Зямную цвердзь да магмы разгайдалі
Срыжалі электрычных правадоў.
Паэт —
сейсмограф трапяткога часу.
І — строга ўпаўнаважаны жыццём —
Рытм пакалення і яго акрасу
Перадае сваім сэрцабіццём.
Згадай —
падскокваў твой лясны закутак,
За сотню вёрст асляплены кастром,
Калі не дзень,
а дваццаць трое сутак
Грымела бітва над сівым Дняпром.
Таму не дзіўна з-пад счарнелых касак,
Якім не пасвяжэць і ад расы,
Убачыць бляск чырвоназорных касак,
Пачуць байцоў сасмяглых галасы,
Ніводнай не мінаючы руіны,
Тады па іншых лётаў ты франтах
Праз полымя і боль усёй краіны —
Як безгалосы агнякрылы птах.
Зноў расцілае горад самабранку —
Мядовасць хмар з туманным малаком, —
Дзе з добрым другам кожны раз
да ранку
Ажно хмялелі над любым радком.
Праймае грудзі сінява скразная —
Надзей крылатасць
і святло магіл,
Што з далікацтвам чуйным ахінае
Па-пысінску лагодны небасхіл.

Верш «Памяці Аляксея Пысіна» С. Гаўрусёва

(ДАМаг. Ф. 1244, Воп. 32, Спр. 21, Ар. 9)







УК «Магілёўская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна» з 2011 года праводзіць навукова-практычную канферэнцыю «Пысінскія чытанні», з мэтай больш глыбокага вывучэння творчай спадчыны паэта і знаёмтсва чытачоў з літаратурным жыццём рэгіёна.

(Фота з інтэрнэт-сайтаў ІА «Магілёўскія ведамасці» і Магілёўскага аблвыканкама)

# *СПАСИБО ЗА ВНИМАНИЕ!*

Віртуальная выстава падрыхтавана на аснове дакументаў з фондаў установы «Дзяржаўны архіў Магілёўскай вобласці», а таксама матэрыялаў з адкрытых інтэрнэт-крыніц

Made with GAMMA